УДК 94(476) «1921/1939»:347.237

# АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА ЦЫВІЛЬНАГА АСАДНІЦТВА НАВАГРУДСКАГА ВАЯВОДСТВА

**С.М. Грэсь**
УА «Гродзенскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт»
г. Гродна, Рэспубліка Беларусь

Дадзены артыкул прысвечаны малаасветленай у айчыннай гістарыяграфіі тэме цывільнага асадніцтва. На аснове польскіх крыніц, а таксама архіваў Рэспублікі Беларусь зроблена спроба аналізу паходжання цывільнага асадніцтва на землях Заходняй Беларусі і яго ролі ў палітыцы польскіх улад.

This material is devoted to little studied subject of civil colonization in the national historiography. Based on Polish sources, as well as the archives of the Republic of Belarus made an attempt to analyze the origin of civil colonization on the lands of western Belarus and its role in the politics of the Polish authorities.

Цывільнае асадніцтва на землях Заходняй Беларусі з'ява недастаткова вывучаная па некалькіх прычынах. Па-першае, айчынныя гісторыкі выпускаюць такую праблему са свайго поля зроку з-за недастатковасці крынічнай базы. Па-другое, праблема цывільнага асадніцтва была не агульнай з'явай для ўсёй тэрыторыі Заходняй Беларусі, а толькі фактычна для Навагрудскага ваяводства.

На мясцовым узроўні пачала складвацца апазіцыя з ліку цывільных асаднікаў і заможных сялян. Першыя лічылі, што ваенныя каланісты амаль поўнасцю страцілі свой уплыў на беларускія землі і аказаліся адхіленымі ад кіруючага становішча ў гаспадарчым жыцці. З прычыны таго, што шмат асаднікаў здавалі свае землі ў арэнду, казна Польшчы не далічвалася грошай і па крэдытах. Акрамя таго, цывільныя асаднікі былі пастаўлены ў няроўныя ўмовы з ваеннымі. Так, для іх існавалі больш высокія цэны на зямлю, і яны не маглі карыстацца шэрагам ільгот. Першапачатковая стаўка толькі на палітыку ваеннага асадніцтва як адзіна правільную была памылковай. Асаднікі з цэнтральных ваяводстваў Польшчы не маглі па сваім менталітэце і развіццю зліцца з мясцовым насельніцтвам. Гэта пацвярджае і В. Вітас. У сваёй кнізе ён піша : "...асаднікі з цэнтральных ваяводстваў, а таксама ваенныя асаднікі па сваёй манеры паводзін выклікалі у мясцовых жыхароў жаданне да барацьбы..." [8, с. 18]. Таму, па меркаванню польскіх гісторыкаў таго часу, толькі распаўсюджанне цывільнага асадніцтва змагло б вырашыць праблему зліцця "крэсаў усходніх" з ІІ Рэччу Паспалітай.

Аграрная рэформа па насаджэнню польскага асадніцтва не прынесла жаданых вынікаў, таму ўрад прыняў рашэнне аб надзяленні мясцовых жыхароў зямлёй. Такім чынам, у 1926-1935 г. рэфармаванне



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

беларускай вёскі змянілася даволі істотна. Неабходнасць працягваць рэформы ў дадзеным накірунку была выклікана і тымі абставінамі, што сялянства не задавальнялі ўмовы атрымання зямлі, якія існавалі да гэтага.

Цывільнае асадіцтва ў Навагрудскім ваяводстве ў міжваенны перыяд носіць саматужны характар. Дадзены від асадніцтва распаўсюджваўся на падставе сеймавага рашэння ад 10 ліпеня 1919 г. аб падзеле вялікай сельскагаспадарчай уласнасці на больш дробныя гаспадаркі. На аснове гэтага рашення і далейшых прававых наступстваў, земскія камітэты пачалі ўмешвацца ў справы прыватнай парцэляцыі. Калі гаварыць пра ўсе распараджэнні, якія тычацца саматужнай каланізацыі, то трэба адзначыць, што яго можна падзяліць на тры групы:

1. распараджэнні аб аграрнай рэформе;
2. распараджэнні аб прыватнай і інстытуцыянальнай парцэляцыі;
3. распараджэнні аб парцэляцыі, якая праводзілася праз дзяржаўны сельскагаспадарчы банк [1, стар. 29].

Памеры гаспадарак цывільных асаднікаў залежалі ад станоўчай або адмоўнай гаспадарчай кан’юнктуры, у адрозненні ад вайсковага асадніцтва, якое ў гэты перыяд пачало значна слабець [1, с. 29]. Цывільнае асадніцтва асабліва хутка развівалася ў 1921-1929 гг., вышэйшага уздыму яно дасягнула ў 1923 і 1928 гг., найменшага – у 1921 і 1929 гг. [1, с. 29].

Калі ж гаварыць пра агульную колькасць такога асадніцтва, то неабходна звярнуцца да табліцы 1. У дадзенай табліцы прыведзены дадзеныя па Навагрудскаму ваяводству на 1 студзеня 1933 года.

Табліца 1

| Ваяводства, павет | Колькасць асаднікаў | % да колькасці ў ваяводстве |
|---|---|---|
| Навагрудскае ваяводства | 612 | 100 |
| Баранавіцкі павет | 228 | 37,3 |
| Лідскі павет | 5 | 0,8 |
| Нясвіжскі павет | 18 | 2,9 |
| Навагрудскі павет | 23 | 3,8 |
| Слонімскі павет | 319 | 52,1 |
| Валожынскі павет | 9 | 1,5 |
| Шчучынскі павет | 3 | 0,5 |
| Сталпецкі павет | 7 | 1,1 |

Як бачна з табліцы фактычна цывільнае асадніцтва распаўсюджвалася толькі ў двух паветах Баранавіцкім і Слонімскім, у



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

астатніх жа паветах асадніцкія гаспадаркі існавалі ў невялікай колькасці.

Архіўныя крыніцы па надзяленню асаднікаў зямлёй у Навагрудскім ваяводстве сведчаць, што амаль усе цывільныя асаднікі ваяводства атрымалі свае надзелы праз прыватную парцэляцыю і толькі два – праз дзяржаўную [2, с. 9].

Паводле гэтых жа дадзеных па нацыянальнай прыкмеце сярод цывільных асаднікаў было 87,4 – палякаў; 6,8 – украінцаў; 4,9 – беларусаў; астатнія іншых нацыянальнасцей [2, с. 19].

Што тычыцца пасляваеннай каланізацыі мястэчак і гарадоў Навагрудскага ваяводства, то тут неабходна падкрэсліць, што як і ў вясковым асадніцтве, гэты інстытут асадніцтва ў асноўным развіваўся саматужна, за кошт самастойнага перасялення часткі прадстаўнікоў польскага насельніцтва. Аднак можна адзначыць і факты падтрымкі гэтых асаднікаў з боку дзяржавы. У дадзеным выпадку можна гаварыць пра спецыяльную каланізацыю. Трэба адзначыць, што тут таксама былі праблемы. Растлумачыць гэта можна тым, што гарады і мястэчкі Навагрудскага ваяводства пасля першай сусветнай і савецка – польскай войнаў былі фактычна без насельніцтва, якое было часткова мабілізавана ў арміі розных дзяржаў, а часткова адышло ў вёску ў пошуках лепшага жыцця.

Спецыяльная каланізацыя гарадоў прадугледжвала выдзяленне дзяржавай участкаў у прыгарадах, на якіх пасяляліся польскія чыноўнікі і рамеснікі, звязваючы сябе з новым асяроддзем. Працэсс насаджэння гарадскога асадніцтва распачаўся з 1924 года; вышэйшага ўздыму дасягнуў у 1927 годзе. Да 1932 года ў Навагрудскім ваяводстве было зарэгістравана 502 такія асады, гэта прыкладна 11,1 % ад усіх цывільных асадных гаспадарак, якія ўзніклі на заходнебеларускіх землях з 1920 па 1932 гг. [1, с. 31]

Табліца 2

| Ваяводства, павет | Колькасць асаднікаў | Плошча зямлі ў га |
|---|---|---|
| Навагрудскае ваяводства | 502 | 581 |
| Баранавіцкі павет | 88 | 125,5 |
| Лідскі павет | 5 | 6,2 |
| Нясвіжскі павет | 18 | 13,5 |
| Навагрудскі павет | 37 | 25,9 |
| Слонімскі павет | 129 | 96,3 |
| Валожынскі павет | 186 | 293,2 |
| Шчучынскі павет | 37 | 15,5 |
| Сталпецкі павет | 2 | 4,9 |



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

Як сведчаць дадзеныя з табліцы 2 найбольшая колькасць асадных гаспадарак была створана ў Валожынскім, Слонімскім, Баранавіцкім паветах. Сярэдняя колькасць зямлі, якой валодалі асаднікі гэтай катэгорыі вагалася ў памерах ад 0,4 да 1,5 га зямлі на гаспадарку. Такія невялікія памеры асад былі абумоўлены тым, што іх гаспадары амаль ніякіх адносін да сельскай гаспадаркі не мелі, бо былі або рамеснікамі, або чыноўнікамі мясцовай адміністрацыі.

Пачынаючы з 1933 года цывільнае асадніцтва развівалася па іншаму шляху. У першую чаргу гэта тычыцца палітычнай накіраванасці цывільных асаднікаў. Нягледзячы на меры, якія прадпрымаліся, у цывільнага асадніцтва заставаўся яшчэ шэраг праблем, якія патрабавалі вырашэння. У першую чаргу цывільныя асаднікі імкнуліся змяніць свае функцыі з дарадчых на заканадаўчыя ў мясцовых органах улады. Гэта давала ім шанс зацвердзіць сябе ў ролі прывілеяванага саслоўя польскага грамадства на ўсходніх крэсах.

Такая пазіцыя тлумачылася некалькімі фактамі: па-першае, польскія улады бачылі ў цывільных асадніках больш уплывовую сілу чым ваенныя. Цывільныя асаднікі не адмяжоўваліся ад мясцовага насельніцтва, таму сяляне не бачылі ў іх варожага элемента. Па-другое, цывільныя асаднікі звычайна куплялі зямлю, што ставіла іх на адзін узровень з сялянамі і не выклікала такога супраціўлення з боку астатніх. Па-трэцяе, цывільныя асаднікі часткова паходзілі з мясцовых сялян.

Асноўнай крыніцай паступлення зямлі ў распараджэнне цывільных асаднікаў была прыватная парцэляцыя. Такім чынам, з вышэй акрэсленага вынікае, што адносіны да цывільных асаднікаў з боку польскага ўрада не былі адназначнымі. Так, напачатку правядзення рэформы ён не рабіў стаўкі на цывільных. Аднак з цягам часу, зразумеўшы непераканаўчы характар ваеннага асадніцтва, вымушаны быў звярнуцца да цывільных асаднікаў.

Асабліва гэта стала відавочным пасля прыняцця пастановы ад 23 мая 1933 года, у якой разглядалася пытанне аб асадніках з ліку невайскоўцаў. Менавіта 15 артыкул дадзенага дакумента надаваў прававы статус і агаворваў месца цывільнага асадніцтва ў польскім грамадстве. З гэтага часу і да канца існавання ІІ Рэчы Паспалітай цывільныя асаднікі з'яўляліся асноўнымі суб'ектамі зямельнай рэформы ў дзяржаве. Рост цывільнага асадніцтва ў гэты перыяд быў асабліва бурны, што магло сведчыць аб тым, што польскі ўрад перагледзеў свае пазіцыі. Цывільныя асады пачынаюць надавацца не толькі выхадцам з цэнтральных раёнаў Польшчы, але і мясцоваму насельніцтву, якое лаяльна адносілася да польскіх уладаў.



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

Цывільнае асадніцтва для польскіх улад было пэўным выхадам са складанага становішча, у якое яно трапіла з-за непрадуманасці і жадання асіміляваць далучаныя заходнебеларускія землі.

**ЛІТАРАТУРА**


1. Milanowski, W. Polska kolonizacja powojenna na ziemiach wschodnich / W. Milanowski. - Warszawa. I.B.S.N. – 1934. –135 s.
2. Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці. - Фонд 1. - Воп. 9. - Спр. 836. Колькасны склад "Саюза асаднікаў" на тэрыторыі Палескага і Навагрудскага ваяводстваў у 1934 г.
3. Сорокин, А.А. Аграрный вопрос в Западной Белоруссии (1920 – 1939 г.) / А.А. Сорокин. – Минск: Наука и техника, 1968 – 204 с.
4. Srokowski, K. Sprawa narodowościowa na Kresach Wschodnich / K. Srokowski. – Kraków – 1924.
5. Srokowski, St. Uwagi o Kresach Wschodnich / St. Srokowski./ – Warszawa. – 1932.
6. Statystyka rolnicza za 1931/1932 rok. Kwartalnik. – Warszawa. – 1933.
7. Stobniak-Smogorzewska, J. Kresowe osadnictwo wojskowe 1920 – 1945 / J. Stobniak-Smogorzewska. – Warszawa: Instytut studiów politycznych PAN, Oficyna wydawnicza RYTM, 2003.
8. Witos, W. Wybór pism i mów / W. Witos. – Lwów. Dom Książki Polskiej, 1939 .


УДК 94 (47). 082 (476.6): 329.7

## НАРОДНИЧЕСКИЕ ОРГАНИЗАЦИИ НА ГРОДНЕНЩИНЕ


**С.М. Гресь, С.Р. Шагбутдинов**

УО «Гродненский государственный медицинский университет»

г. Гродно, Республика Беларусь



В представленной статье рассматриваются основные моменты зарождения народнического движения на Гродненщине. Данная проблематика интересна тем, что в отечественной историографии она отражена недостаточно полно.

In the present article considers the role of populists and political organizations in the formation the populist movement in the territory of Grodno province in the nineteenth century. The article is interesting because in the national historiography not considered these problems.


Теоретические основы народничества разрабатывались А.И. Герценом и Н. Г. Чернышевским в период, «когда революционность буржуазной демократии уже умирала (в Европе), а революционность социалистического пролетариата ещё не созрела» [1, с.27]. Народничество выражало классовые интересы крестьянства и других мелких производителей и являлось главным идейно-теоретическим направлением разночинного, буржуазно-демократического движения в России.

В первой половине 70-х годов в Вильно существовало 3 нелегальных кружка. Один из них, кружок Виленского учительского института, имел постоянные связи с демократической молодежью ряда белорусских городов, пересылая туда революционную литературу и



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ